***Гаўрылава С.В.***

# Асноўныя кірункі аднаўлення і развіцця г. Полацка ў 1944–1954 гг.

## Частка 3. Ахова здароўя, адукацыя, культура, фізкультура і спорт

За гады нямецка-фашысцкай акупацыі г. Полацк моцна пацярпеў. Былі поўнасцю знішчаны даваенныя ўстановы аховы здароўя (2 бальніцы, 2 паліклінікі, 2 кансультацыі, 6 дзіцячых ясляў), сетка ўстаноў адукацыі (12 дзіцячых садкоў, 16 агульнаадукацыйных школ, 5 спецыяльных навучальных устаноў) і культуры (11 клубаў, Дом настаўніка, Дом Чырвонай Арміі, тэатр, кінатэатр, 9 бібліятэк, краязнаўчы музей), спынілася развіццё фізічнай культуры і спорту. Усё гэта прыйшлося нанова аднаўляць у пасляваенны перыяд. Гэтая задача была ўскладзена ў першую чаргу на загадчыкаў утвораных у сакавіку 1945 г. пры гарвыканкаме 6 пастаянна дзеючых камісій, у лік якіх уваходзілі культурна-асветніцкая (загадчык тав. Федаценкава) і аховы здароўя (загадчык тав. Фарынка) [**20**, л. 28].

### Ахова здароўя

Адразу пасля вызвалення Полацка пачаліся работы па аднаўленні медыцынскіх устаноў. Аднавіў работу гарадскі аддзел аховы здароўя, які размясціўся па вул. Леніна, 32. З першых дзён у горадзе пачала працаваць бальніца імя Леніна на 50 ложкаў. У адным будынку з бальніцай адкрылася гарадская паліклініка. К сярэдзіне 1945 г. колькасць медыцынскіх устаноў абласнога цэнтра значна павялічылася: абласная бальніца на 150 ложкаў, гарадская паліклініка, дзіцячая і жаночая кансультацыя, венералагічны і туберкулёзны дыспансеры, дзіцячы прыёмнік НКУС, Полацкая станцыя хуткай дапамогі. Да канца года аблбальніца пашырылася да 250 ложкаў, акрамя таго пачалі працаваць радзільнае аддзяленне і аптэка, з'явіліся малочная кухня і зубапратэзная майстэрня [**18**, с. 233]. У маі 1946 г. быў зацверджаны штат бальніцы імя Леніна, дзе мелася ўжо 360 ложкаў, на 298,5 адзінак [**21**, л. 191]. Для абслугоўвання партыйнага і савецкага актыву Абладдзел аховы здароўя ў верасні 1946 г. адкрыў спецпаліклініку [**21**, л. 159]. У 1948 г. сетка дыспансераў пашырылася за кошт адкрыцця анкалагічнага дыспансера [**24**, с. 698].

На 1 студзеня 1949 г. хворых прымалі ў абласной бальніцы з хірургічным, тэрапеўтычным, інфекцыйным, сухотным, радзільным, гінекалагічным, скурна-венерычным, дзіцячым, вокавым і вушным аддзяленнямі. Паліклінічнае ад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

дзяленне налічвала 17 кабінетаў, уключала жаночую і дзіцячую кансультацыі, зубапратэзную лабараторыю, хуткую дапамогу [**21**, л. 14].

У 1952 г. ложкавы фонд абласной бальніцы імя Леніна пашырыўся да 400 адзінак, пачала функцыянаваць біяхімічная лабараторыя. У паліклінічным аддзяленні былі абсталяваны кабінеты па ўсіх спецыяльнасцях. Была наладжана сетка дыспансераў: туберкулёзны, скурна-венерычны, анкалагічны і фізкультурны [**9**, с. 14].

**Сеткавыя паказчыкі па ахове здароўя г. Полацка за 1952 г.** [**9**, с. 52].

| | План на 1952 г. | Фактычна выканана за 1952 г. |
|---|---|---|
| Усяго бальнічных установаў | 1 | 1 |
| у іх ложкаў | 400 | 400 |
| з іх сухотныя | 30 | 30 |
| радзільныя | 45 | 45 |
| дзіцячыя (інфекцыйныя і неінфекцыйныя) | 60 | 60 |
| Колькасць дзён работы бальнічнага ложка ў год | 340 | 363 |
| Абласныя, гарадскія бальніцы | 1 | 1 |
| ложкаў у іх | 400 | 400 |
| Дыспансеры: 1) процісухотныя дыспансеры | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 7 | 7 |
| 2) скурна-венерычныя дыспансеры | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 7 | 7 |
| 3) анкалагічныя дыспансеры | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 5 | 4,75 |
| 4) урачэбна-фізкультурныя дыспансеры | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 3 | 3 |
| Усяго дыспансераў са стацыянарам | 4 | 4 |
| у іх урачэбных пасад | 22 | 21,75 |
| Урачэбныя здароўпункты | 2 | 2 |
| у іх урачэбных пасад | 2 | 2 |
| Фельчарскія здароўпункты | 2 | 2 |
| Станцыі хуткай дапамогі | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 6 | 6 |
| Станцыі санітарнай авіяцыі | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 2 | 2 |
| Станцыі пералівання крыві | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 3 | 2,5 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| Колькасць дзіцячых ясляў | 2 | 2 |
| у іх месцаў | 145 | 145 |
| Урачэбных пасад у яслях | 1,5 | 1,5 |
| Колькасць дзён работы ясельнага месца ў год | 250 | 533 |
| Колькасць санэпідстанцый | 2 | 2 |
| у іх урачэбных пасад | 17 | 17 |
| Процімалярыйныя станцыі | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 3 | 3 |
| Дом санітарнай асветы | 1 | 1 |
| у іх урачэбных пасад | 2 | 2 |
| Урачэбныя пасады ў бюро судмедэкспертызы | 4 | 4 |
| Аптэкі | 2 | 2 |
| Крамы і аптэчныя майстэрні | 2 | 2 |
| Аптэчныя кіёскі, ларкі і пункты | 2 | 5 |
| Кантрольна-аналітычныя лабараторыі | 1 | 1 |
| Урачэбныя кадры: | | |
| агульная колькасць урачэбных пасад | 161,5 | 157,25 |
| у т.л. у санітарна-проціэпідэмічных установах | 22 | 22 |

К канцу 5-й пяцігодкі (1951–1955 гг.) у Полацку працавала 9 лячэбна-прафілактычных установаў, у тым ліку бальніца, аб'яднаная з паліклінікай, дзіцячай і жаночай кансультацыямі, працісухотны дыспансер, 5 фельчарскіх пунктаў. Гарбальніца аказвала медыцынскую дапамогу не толькі гораду, але і сялу, абслугоўваючы хворых шэрагу раёнаў вобласці [**11**, с. 17].

Акрамя грамадзянскіх медустаноў, у Полацку пасля вызвалення знаходзіліся гарнізонная паліклініка і шпіталь у памяшканні Кадэцкага корпуса, шпіталі ў Богаяўленскім саборы, у жылых дамах па вул. Леніна, шпіталь у галоўным корпусе ляснога тэхнікума. Да канца кастрычніка 1944 г. усе палявыя шпіталі з горада вывезлі [**25**, с. 493].

З года ў год значна павялічвалася колькасць спецыялістаў-медыкаў. Калі ў сярэдзіне 1945 г. ва ўсім горадзе працавала толькі 3 урачы пры запатрабаванай колькасці 10 [**6**, л. 24], то ў наступным годзе ў лячэбных установах стацыянарнай і ўрачэбна-амбулаторнай паліклінічнай дапамогі працавала ўжо 55 урачоў, у т.л. 45 з вышэйшай адукацыяй [**4**, с. 18]. К канцу 1940-х гг. у медыцынскіх установах Полацка працавалі 63 урачы, а к сярэдзіне 1950-х гг. медыцынскія кадры дасягнулі колькасці 108 урачоў і каля 300 чалавек сярэдняга медперсаналу [**11**, с. 17].

У пасляваеннае дзесяцігоддзе ўлады праяўлялі асаблівы клопат пра дзяцей і мацярынства. Ужо ў пачатку жніўня 1944 г. было аб'яўлена аб адкрыцці першых ясляў па вул. Пушкіна, 34. Да канца 1944 г. у Полацку былі адкрыты яслі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на 50 месцаў і жаноча-дзіцячая кансультацыя, якая ў наступным годзе была падзелена на дзве – жаночую і дзіцячую. Колькасць ложкаў у радзільным доме дасягнула 25, а ў дапамогу ўжо нарадзіўшым жанчынам была адкрыта малочная кухня [**21**, л. 51]. У студзені 1945 г. пад дзіцячыя яслі міліцыі быў адведзены будынак па вул. Гогаля – Карла Маркса, 48/3 [**21**, л. 19]. У маі з эвакуацыі з Чувашскай АССР вярнуўся Полацкі дом дзіцяці імя Самойлавай, якому было выдзелена памяшканне па вул. Пушкіна, 34 разам з яслямі [**20**, л. 68]. З пераходам да мірнага жыцця назіралася павелічэнне колькасці дзяцей, самых маленькіх з якіх у 1946 г. прымала 3 ясляў на 315 месцаў [**4**, с. 18]. У сакавіку 1947 г. быў адноўлены дом груднога дзіцяці, які існаваў да вайны [**23**, л. 138]. У летні час пры школах горада арганізоўваліся аздараўляльныя пляцоўкі і піянерскія лагеры.

У цяжкі перыяд аднаўлення ўсім медыцынскім установам прыходзілася цясніцца, бо рамонт старых і пабудова новых будынкаў ішлі вельмі марудна. У 1945 г. у Полацкай абласной бальніцы імя Леніна адсутнічалі вадаправод і каналізацыя; кухня, пральня і прыёмны пакой не былі добраўпарадкаваны; не хапала паліва, прадметаў догляду за хворымі. Дрэнна была наладжана справа з дыетычным харчаваннем з-за адсутнасці кухоннага посуду і недаатрымання поўнага асартыменту прадуктаў харчавання [**21**, л. 21]. Гарпаліклініка не мела ўласнага памяшкання і размяшчалася ў радзільным доме. Па той жа прычыне ў будынку бальніцы размяшчаліся санэпідэмстанцыя, абладдзел і гараддзел аховы здароўя, аптэкаўпраўленне [**21**, л. 92].

У 1946 г. была праведзена работа па пашырэнні сеткі ложкаў аблбальніцы імя Леніна, якую абсталявалі мяккім і цвёрдым інвентаром. У той жа час адсутнічала дастатковая колькасць дзіцячых ложкаў, памяшканняў для венерычнага аддзялення, дзіцячага і тэрапеўтычнага аддзяленняў, а ў радзільным доме адсутнічала асобнае памяшканне для апрацоўкі парадзіх, перадродавыя палаты, родавая палата не была прыстасавана для парадзіх. Электраэнергіяй бальніца забяспечвалася з перабоямі, таму для асвятлення выкарыстоўвалі газоўкі, з-за чаго ў памяшканнях назапашваўся курадым. Не былі адноўлены каналізацыя і вадаправод, што было прычынай дрэннага санітарнага стану медустановы [**20**, л. 87].

У 1945–1946 гг. шэраг памяшканняў, якія раней належалі арганізацыям аховы здароўя, былі заняты пад жыллё медработнікаў. Частка памяшканняў аблбальніцы была занята пад склад і апарат аптэкаўпраўлення, з-за чаго адсутнічалі санітарныя прапускнікі пры галоўным корпусе і інфекцыйным аддзяленні. Радзільны дом быў заняты пад гарпаліклініку, у будынку якой быў дзіцячы сад і жылыя памяшканні [**21**, л. 77]. Акрамя таго, на рамонт не хапала будматэрыялаў і рабочай сілы. Аднаўленне будынкаў бальніцы і радзільнага дома было скончана толькі ў 1947 г., будынак жа паліклінікі па вул. Войкава, 12 быў здадзены ў эксплуатацыю ў 1950 г. [**20**, л. 55]. У адным будынку з гарпаліклінікай размясціліся станцыя пералівання крыві, жаночая і дзіцячая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кансультацыі, сельская паліклініка. З пераездам аблвыканкама на вул. Леніна ў яго былым будынку размясціўся скурна-венерычны (галоўны ўрач Вараб'ёў), анкалагічны (галоўны ўрач Ізмайловіч) дыспансеры і санэпідэмстанцыя (галоўны ўрач Каждан) [**8**, с. *234*].

У жніўні 1948 г. быў зацверджаны генеральны план аднаўлення і развіцця Полацка, які прадугледжваў пераўтварэнне Верхняга замка ў бальнічны гарадок. Прыватныя дамы на гэтай тэрыторыі будаваць было забаронена, але асобныя ўрачы ўсё ж пабудавалі ўласнае жыллё. У хуткім часе побач з бальніцай з'явіўся будынак абласнога і гарадскога аддзелаў аховы здароўя, пад інфекцыйнае аддзяленне была перададзена казарма, а пазней зборны пункт ваенкамата. Пачалося пашырэнне радзільнага аддзялення [**8**, с. *235*].

У пасляваенным Полацку востра стаяла праблема ракавых захворванняў, і тагачасная медыцына абяцала хуткае з'яўленне прэпарата, здольнага вылечваць захворванне на ўсіх стадыях [**10**]. Побач з наладжваннем мірнага жыцця і сямейнага дабрабыту паўстала праблема крымінальных абортаў. У той час, калі многія сем'і не мелі ўласнага жылля, жанчыны гатовы былі за аперацыю плаціць па 1,5 тыс. рублёў, аддаваць апошнія прадукты і «мануфактуру». Аборты праводзіліся далёка не заўсёды прафесійнымі медыкамі і ва ўмовах лячэбнай установы. Для барацьбы з гэтай з'явай у 1946 г. была створана спецыяльная абласная камісія [**12**]. Шмат увагі медыкі надавалі барацьбе з летнімі кішэчнымі захворваннямі.

Дрэннай была сітуацыя з захворваннямі дзяцей, асабліва на сухоты. Каб ізаляваць хворых, улады вобласці прынялі рашэнне ў снежні 1945 г. арганізаваць для дзяцей з сухотнай інтаксікацыяй дзіцячы сад на *25* месцаў [**21**, л. 159]. Барацьба з захворваннем ішла марудна, праз 4 гады пасля заканчэння вайны назіралася яшчэ вялікая колькасць хворых дзяцей. Таму ў кастрычніку 1952 г. было уведзена ў эксплуатацыю дзіцячае сухотна-менінгітнае аддзяленне на 10 ложкаў [**9**, с. 14].

У горадзе і вобласці было шмат хворых на фавус (хранічны дэрматамікоз). У 1947 г. было прынята рашэнне пры аблбальніцы імя Леніна адкрыць часовы ізалятар на 40 ложкаў для гаспіталізацыі хворых на фавусных з дзіцячых дамоў [**21**, л. *234*]. У канцы 1945 – пачатку 1946 г. рэзка павялічылася колькасць захварэўшых на паразітарны і брушны тыф [**21**, л. 91]. Толькі к пачатку 1950-х гг. медыкі дабіліся значнага зніжэння інфекцыйных захворванняў: за ўвесь 1952 год не было зарэгістравана ніводнага выпадку сыпнога тыфу, назіралася зніжэнне дзіцячых інфекцыйных захворванняў [**9**, с. 14].

З усіх медыцынскіх устаноў найбольшыя нараканні выклікала работа станцыі хуткай дапамогі. Неаднаразова ўскрываліся факты выкарыстання спецмашыны не па прамым прызначэнні, адсутнічаў улік выклікаў, урачы вымушаны былі аказваць дапамогу, дабіраючыся да хворага пешшу, прыходзілі на 2–3 дні пазней ці не прыходзілі ўвогуле [**20**, л. 105]. Толькі к 1952 г. станцыя была поўнасцю ўкамплектавана ўрачэбнымі кадрамі. Меліся 3 санітарныя ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шыны, з якіх 1 легкавая маркі «Масквіч», але не было гаража. У той жа час не хапала памяшканняў для прыёму хворых і размяшчэння медперсаналу: станцыя займала ў будынку паліклінікі 1 пакой, дзе разам знаходзіліся ўрачы, сёстры, санітаркі і шафёр, не было магчымасці аказваць медыцынскую дапамогу непасрэдна на станцыі [**9**, с. 16].

У 1952 г. абслугоўванне хворых дома праводзілася па ўчастковым прынцыпе, для чаго тэрыторыя горада была падзелена на ўчасткі. За кожным з іх быў замацаваны ўрач, які праводзіў на сваім участку лячэбна-прафілактычную работу. Са студзеня таго ж года дома пачалі праводзіць гінекалагічнае і хірургічнае абслугоўванне хворых. Было ўведзена і абслугоўванне дзяцей 4–14 гадоў па сістэме адзінага педыятра дзіцячай кансультацыі, што да таго часу праводзілася ўрачамі-тэрапеўтамі [9, с. 14].

Урачы праводзілі вялікую прафілактычную работу: арганізоўвалі вечары пытанняў і адказаў у гарадскім клубе, чыталі лекцыі. Арганізаваны пасля вайны Дом санітарнай асветы размясціўся ў адным з дамоў па вул. Скарыны; пазней ён быў пераведзены на вул. Леніна [**8**, с. 235].

У сакавіку 1945 г. пры аблсавеце была арганізавана пастаянна дзеючая камісія па ахове здароўя з 5 чалавек, якую ўзначаліў А.Б. Кацнельсон [**21**, л. 97]. У 1946 г. загадчыкам Абласнога аддзела аховы здароўя стаў тав. Алтунін. З 1945 г. бальніцу ўзначальваў М.А. Каранеўскі, біяхімічную лабараторыю Ю. Астроўскі, будучы акадэмік Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, заснавальнік Інстытута фармакалогіі і біяхіміі ў г. Гродна. У красавіку 1945 г. загадчыкам аблбальніцы імя Леніна быў назначаны А.Л. Дарасінскі, абласной санэпідстанцыяй – А.Б. Кацнельсон, абласной станцыяй пералівання крыві – В.А. Ізмайловіч [**21**, л. 164]. З 1953 г. галоўным урачом бальніцы была А.М. Палыгаліна.

**Адукацыя**

Побач з праблемай забеспячэння надзённых патрэб насельніцтва ў харчаванні і жыллі, у пасляваенным горадзе паўстала праблема аднаўлення сеткі адукацыйных устаноў. На першым жа пасяджэнні гарвыканкама 29 ліпеня 1944 г. гарадское кіраўніцтва абавязала гарана ўжо 1 жніўня адкрыць у Полацку дзіцячы дом школьнага тыпу, пад які быў адведзены даваенны будынак дзіцячага дома [**20**, л. 1], але арганізацыя яго ішла вельмі марудна. К пачатку навучальнага года павінны былі адкрыцца: 1 дзіцячы дом школьнага тыпу, 1 сярэдняя, 2 няпоўныя сярэднія, 2 пачатковыя школы, 2 дзіцячыя садкі. 1 верасня 1944 г. пачалі работу школы № 1, 2, 3 і чыгуначная школа ў Грамах. Для іх размяшчэння было прыстасавана некалькі будынкаў [**25**, с. 493].

З даклада гарана вядома, што на 30.12.1944 г. у Полацку працавала 7 школ: 1 сярэдняя, 3 няпоўныя сярэднія, 2 пачатковыя і 1 чыгуначная няпоўная сярэдняя школа. Колькасць вучняў складала 1694 чалавекі ў гарадскіх школах і 372 чалавекі ў чыгуначнай школе. Акрамя таго быў 1 дзіцячы дом змешанага тыпу,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзе выхоўвалася 135 дзяцей, і 2 дзіцячыя садкі з 94 выхаванцамі. Педагагічны калектыў горада налічваў 58 чалавек [**6**, л. 3].

З мэтай забеспячэння школ настаўніцкімі кадрамі быў праведзены пошук педагогаў, якія працавалі не па спецыяльнасці, і быў афармлены іх перавод на педагагічную працу [**21**, л. 15]. Настаўнікі, якія не мелі адпаведнай кваліфікацыі, павінны былі скончыць завочныя аддзяленні педагагічных навучальных устаноў у вызначаныя тэрміны: настаўнікі 1–4 класаў – педвучылішча к 1 жніўня 1947 г., настаўнікі 5–7 класаў – настаўніцкія інстытуты к 1 жніўня 1946 г., настаўнікі 8–9 класаў – педінстытуты і ўніверсітэты к 1 жніўня 1948 г. Аблана павінен быў 1 раз у 3 месяцы праводзіць праверку выканання вучэбных заданняў, вызваляць настаўнікаў-завочнікаў ад пазавучэбнай працы на працягу 4 вечароў на тыдзень, забяспечваць сшыткамі ў колькасці 15 штук на год, арганізаваць для завочнікаў кансультацыйныя пункты 1 на 200 чалавек, арганізаваць бібліятэкі-перасоўкі пры бібліятэках і педвучылішчы, забяспечыць радыёвяшчанне лекцый [**21**, л. 31].

Многія падлеткі, адукацыя якіх была перарвана ў гады вайны, замест вучобы ўладкоўваліся на працу, таму для іх гарвыканкам загадаў з 1 кастрычніка 1945 г. адкрыць вячэрнія школы працоўнай моладзі з 14-гадовага ўзросту пры наяўнасці не менш за 40–50 чалавек, а асобныя класы пры наяўнасці 15–20 чалавек. Установы былі падзелены на 2 тыпы: 7-гадовыя – 5–7 класы, 10-гадовыя – 5–10 класы [**20**, л. 32]. У наступным годзе вячэрнія няпоўна-сярэднія школы працоўнай моладзі былі арганізаваны пры Полацкай НСШ № 3 па вул. Красіна і пры 59-й чыгуначнай школе [**19**, л. 10].

На 1 мая 1945 г. сетку ўстаноў школьнай і дашкольнай адукацыі складалі: 1 сярэдняя школа, 5 няпоўных сярэдніх, 2 садкі, 1 дзіцячы дом [**6**, л. 22]. Пры правядзенні аналізу вучэбна-выхаваўчай работы школ аддзел народнай адукацыі, які з лютага 1945 г. узначальваў І.А. Пенкрат, адзначаў адсутнасць абсталявання і наглядных дапаможнікаў, недастатковы кантроль за работай настаўнікаў, недастатковую работу бацькоўскіх камітэтаў, настаўнікаў над павышэннем уласнага адукацыйнага і ідэйна-палітычнага ўзроўню, нязначны рост колькасці піянераў і камсамольцаў.

У жніўні 1945 г. перад новым навучальным годам была праведзена рэгістрацыя дзяцей школьнага ўзросту па г. Полацку. Мерапрыемства паказала, што адукацыяй ахоплена 2500 чалавек, аднак з-за затрымкі аднаўлення будынка 2-й сталінскай сярэдняй школы гэтая колькасць дзяцей не магла наведваць адукацыйную ўстанову. У выніку, толькі па адной СШ № 1 200 навучэнцаў не маглі быць ахоплены навучаннем з-за адсутнасці месцаў. Выйсце было знойдзена ў часовым абсталяванні класных пакояў у Доміку Пятра І для рускай школы № 1 і адкрыцці на тэрыторыі Зялёнага гарадка сярэдняй школы [**20**, л. 104].

У 1945/1946 навучальным годзе школы горада працавалі ў 3 змены, у іх навучалася 2715 чалавек, толькі ў школе № 1 было 1200 вучняў. На 1 лютага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1946 г. толькі адна школа працавала ў прыстасаваным цагляным будынку [**21**, л. 103]. Для разгрузкі беларускіх школ у жніўні 1946 г. на вул. Леніна ў будынку былой сярэдняй рускай школы № 1, якую перавялі ў будынак па вул. Пушкіна, 20, была адкрыта сярэдняя беларуская школа № 7 [**20**, л. 34]. Пры школах № 1, 2, 59 (чыгуначная) былі арганізаваны вячэрнія школы [**20**, л. 53]. Нумары школ у пасляваенны перыяд не адпавядалі нумарам школ, што працавалі ў Полацку да вайны, а надаваліся ўстановам у залежнасці ад пачатку заняткаў. Праведзены ў канцы 1946 г. падлік паказаў, што ў Полацку працавала 8 агульнаадукацыйных школ з колькасцю вучняў 4544, 3 вячэрнія школы з колькасцю вучняў 226, 146 настаўнікаў, у т.л. 21 з вышэйшай адукацыяй, 2 садкі і яслі на 110 месцаў. Дзве з трох сямігадовых і адна з дзвюх сярэдніх школ былі беларускімі [**21**, л. 240, 242].

У 1947/48 навучальным годзе была адкрыта 7-гадовая руская школа №8 па вул. Горкага ў былым будынку СШ № 10, які пасля вызвалення горада выкарыстоўваўся пад размяшчэнне гасцініцы. Фактычна ў Полацку на той час працавалі 2 пачатковыя, 4 няпоўныя сярэднія і 2 сярэднія школы; усяго налічвалася 80 камплектаў 1–4 класаў, 23 камплекты 5–7 класаў, 8 камплектаў 8–10 класаў [**21**, л. 227]. З-за адсутнасці спецыялізаваных будынкаў многія школы вымушаны былі займаць грамадскія пабудовы і нават прыватныя дамы. З 11 школ толькі 3 установы знаходзіліся ў спецыяльных школьных будынках. У 1947/48 навучальным годзе была ўведзена абавязковая 7-гадовая адукацыя, што значна павысіла колькасць вучняў у 5–7 класах. З 590 чалавек, якія скончылі ў 1948 г. 4-ы клас, у 5-ы паступілі 549, а у наступным 1949 г. з 742 толькі 1 выпускнік не пайшоў у 5-ы клас [**20**, л. 183].

Працэс навучання ў пасляваенны перыяд наладжваўся з цяжкасцямі: не хапала падручнікаў, дапаможных матэрыялаў і пісьмовых прылад. Колькасць дзяцей школьнага ўзросту з года ў год павялічвалася, месцаў у школах на ўсіх не хапала. Так, у 1948 г. усе школы Полацка працавалі ў 3 змены, замест устаноўленых 35 чалавек у класах было па 50–60 вучняў, за 1 партай сядзелі па 3–4 чалавекі. У выніку, толькі ў першай чвэрці 1947/1948 навучальнага года непаспяховасць складала амаль 30 %: з 3676 вучняў не паспявалі 1075 [**20**, л.8]. Аналіз работы школ у тым навучальным годзе і падрыхтоўкі да новага навучальнага года паказаў, што з-за непаспяховасці з 3590 чалавек 313 атрымалі заданні на лета, 267 засталіся на другі год (не паспявалі па беларускай мове, матэматыцы, гісторыі) [**20**, л. 55].

Непаспяховасць звязвалі не толькі з нізкай матэрыяльнай забяспечанасцю навучальных устаноў, але і з недахопам кваліфікаваных кадраў. Так, у пачатку 1947/1948 навучальнага года з 136 настаўнікаў вышэйшую адукацыю мелі толькі 26, нясконччаную вышэйшую — 24, сярэднюю — 86. Прааналізаваўшы работу школ, Полацкі гарвыканкам прыйшоў да высновы аб неабходнасці замены некаторых настаўнікаў з тых, што знаходзіліся падчас вайны на акупаванай тэрыторыі, якіх у полацкіх школах працавала на той час

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

59 чалавек, і кіраўнікоў школ [**20**, л. 8]. У канцы года ў школах абласнога цэнтра працавала ўжо 149 настаўнікаў, з якіх 32 мелі вышэйшую адукацыю, 4 былі Заслужанымі настаўнікамі БССР, 12 былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. У 1948 г. ордэнам Леніна былі адзначаны А.Г. Александровіч, настаўнік СШ № 7, В.Г. Казьяніна, настаўнік СШ № 3, Т.І. Азернікава, настаўнік СШ № 1; ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — Л.Г. Дэйніс, дырэктар СШ № 2; Знакам гонару — У.К. Азернікаў, настаўнік СШ № 1 [**21**, л. 67]. У 1950 г. са 166 настаўнікаў 40 мелі вышэйшую, 36 — няскончаную вышэйшую адукацыю [**21**, л. 39].

У выніку, колькасць вучняў, якія не паспявалі, скарачалася з кожным годам. Калі на 1 студзеня 1949 г. з 4250 не паспявалі 816 чалавек, ці 19,2 %, то праз год з 4520 такіх было 717, ці 15,8 % [**22**, л. 183]. У 1950/1951 навучальным годзе з 4401 не паспявалі 647, ці 14,7 %. Асабліва нізкая паспяховасць назіралася па рускай (724 чалавекі), беларускай (469 чалавек) мовах і матэматыцы (382 чалавекі) [**7**, л. 55]. Выпускнікі вячэрніх школ часта паспявалі лепш за вучняў дзённых школ. Так, у 1951 г. 3 скончылі вячэрнюю школу з залатым медалём, 1 з сярэбраным, у той час як у выпускнікоў СШ № 1 і 7 было толькі 2 такія медалі [**7**, л. 11].

Скарачалася і колькасць дзяцей, якія па розных прычынах увогуле не наведвалі школу. Калі ў 1950 г. такіх было 23, то ў 1951 г. ужо 10 чалавек. Сярод дарослага насельніцтва ў той перыяд яшчэ заставалася значная колькасць непісьменных ці малапісьменных. Так, у 1951 г. з 186 малапісьменных навучаліся толькі 49 чалавек і 21 з ліку 53 непісьменных [**7**, л. 10].

У пачатку 1950-х гг. у Полацку ў 1 пачатковай, 2 няпоўных сярэдніх і 5 сярэдніх навучалася 4800 чалавек. 514 чалавек наведвалі 3 вячэрнія школы. СШ № 1 працавала ў 3 змены, у школах № 2, 3, 8 акрамя дзвюх дзённых змен працавалі вячэрнія школы. Акрамя таго працавалі 2 чыгуначныя школы. Два дзіцячыя садкі, разлічаныя на 125 месцаў разам, фактычна наведвала 172 чалавекі [**9**, с. 12].

**Звесткі аб колькасці школ, класаў і вучняў па школах г. Полацка за 1952 г.** [**9**, с. 54].

| | Па плану на 1952 г. | Фактычна за 1952 г. |
|---|---|---|
| 1. Колькасць школ усяго<br>у т.л. пачатковых<br>няпоўных сярэдніх<br>сярэдніх | 9<br>1<br>3<br>5 | 8<br>1<br>2<br>5 |
| 2. Колькасць вучняў усяго<br>у т.л. 1–4 кл.<br>5–7 кл.<br>8–10 кл. | 5040<br>1500<br>2540<br>1000 | 4800<br>1630<br>1340<br>880 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| 3. Колькасць класаў-камплектаў усяго<br>у т.л. 1–4 кл.<br>5–7 кл.<br>8–10 кл. | 151<br>47<br>75<br>29 | 145<br>49<br>69<br>27 |
| 4. Прыём у школы ўсяго<br>у т.л. у 1-я класы<br>5-я класы<br>8-я класы | 1575<br>270<br>700<br>605 | 1862<br>403<br>877<br>582 |
| 5. Выпуск са школ усяго<br>у т.л. з 4-х кл.<br>7-х кл.<br>10-х кл. | 1360<br>675<br>605<br>80 | 1201<br>617<br>508<br>76 |
| 6. Напаўняльнасць класаў<br>у т.л. у 1–4 кл.<br>5–7 кл.<br>8–10 кл. | <br>31,9<br>33,8<br>34,4 | <br>33,2<br>33,9<br>30,7 |
| Вячэрнія школы: | | |
| 1. Колькасць школ усяго<br>у т.л. пачатковых<br>няпоўных сярэдніх<br>сярэдніх | 3<br>–<br>2<br>1 | 3<br>–<br>1<br>1 |
| 2. Колькасць вучняў усяго<br>у т.л. 1–4 кл.<br>5–7 кл.<br>8–10 кл. | 540<br>20<br>240<br>280 | 514<br>76<br>206<br>232 |
| 3. Колькасць класаў-камплектаў усяго<br>у т.л. 1–4 кл.<br>5–7 кл.<br>8–10 кл. | 29<br>1<br>12<br>16 | 26<br>5<br>11<br>10 |
| Дзіцячыя сады: | | |
| Колькасць дзіцячых садоў<br>у іх месцаў<br>Колькасць дзяцей | 2<br>125<br>125 | 2<br>125<br>172 |

У пасляваенны перыяд аднавілі сваю работу ўстановы сярэдне-спецыяльнай адукацыі. У 1946 г. у Полацку працавала 3 тэхнікумы і вучылішчы з агульнай колькасцю навучэнцаў 643 чалавекі [**4**, с. 12]. К 1952 г. тыя ж навучальныя ўстановы наведвала ўжо 911 чалавек [7, л. 56].

Пасля вызвалення БССР на ст. Бігосава Дрысенскага раёна быў адкрыты Полацкі будаўнічы тэхнікум. Кіраўніцтву ўстановы ў 1945–1946 гг. выдзялялі грошы на аднаўленне будынка па вул. Фрунзэ ў Полацку [**21**, л. 19], аднак з-за таго, што выкладчыкі мелі ў Бігосава кватэры, зямельныя ўчасткі, вялі гаспадарку, выдзеленыя тэрміны былі спісаны, а тэхнікум перавялі ў Друю.

Згодна з Пастановай СНК БССР ад 04.08.1944 г. № 2-64/5 была адноўлена Полацкая школа медсясцёр з першапачатковай колькасцю навучэнак 120 чалавек [**21**, л. 85]. З-за недахопу памяшканняў школа доўгі час працавала

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў 2-павярховым будынку каля цырульні «Ландыш» па вул. Гогаля [**8**, с. *223*]. У 1947 г. была зроблена спроба аднаўлення будынка былога казначэйства, аднак, пэўна, сродкаў на яго рамонт у кіраўніцтва ўстановы не было [**20**, л. 86]. У 1954 г. на базе школы медсясцёр адкрылася Полацкае медыцынскае вучылішча [**24**, с. 697].

Полацкае педагагічнае вучылішча (дырэктар тав. Радзевіч, затым тав. Сакалоўскі), якое пачало працаваць у 1944 г., таксама доўгі час адчувала патрэбу ў вучэбных памяшканнях і інтэрнаце для навучэнцаў. Спачатку ўстанова месцілася ў ацалелых дамах па вул. К. Маркса [**8**, с. *220*]. У 1945 г. педвучылішча перавялі ў памяшканне ляснога тэхнікума, а затым у былы келейны корпус Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра па вул. Фрунзэ, 89, дзе заняткі праходзілі да 1947 г. З той прычыны, што Полацкі будтэхнікум застаўся на ст. Бігосава, яго цагляны корпус быў перададзены педвучылішчу [**21**, л. *237*]. Аднавіўшы правае крыло будынка з актавай і спартыўнай заламі, вучылішча пераехала ў будынак, які займае па сённяшні дзень.

У пасляваенны перыяд перад абласным кіраўніцтвам ставілася задача не проста ўкамплектаваць школы педагагічнымі кадрамі. Настаўнікі павінны былі мець высокую кваліфікацыю. Таму пры Полацкім педагагічным вучылішчы былі арганізаваны 3-месячныя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў пачатковай школы [**20**, л. 41], з 1 мая 1945 г. быў адкрыты інстытут удасканалення настаўнікаў [**21**, л. *24*], а ў 1952 г. у абласным цэнтры адкрыўся Полацкі педагагічны інстытут [**24**, с. 697].

Распараджэннем СНК СССР ад 30.09.1944 г. № 19331-р была адноўлена дзейнасць Полацкага ляснога тэхнікума [**21**, л. 31]. Але толькі ў снежні Полацкі аблвыканкам абавязаў выканаўцу абавязкаў дырэктара тэхнікума І.П. Дэйніса прыступіць да набору 120 навучэнцаў [**21**, л. 31].

З наладжваннем мірнага жыцця была запатрабавана не толькі сярэдняя і спецыяльная адукацыя. Усё большым попытам карысталіся навучальныя ўстановы дадатковай адукацыі. На першым паверсе Кадэцкага корпуса аднавіла работу музычная школа. З’явілася неабходнасць у музычнай адукацыі дарослага насельніцтва. У пачатку 1947 г. пры Полацкай абласной музычнай школе былі арганізаваны вячэрнія курсы для дарослых па класу фартэпіяна, разлічаныя на 20 навучэнцаў, з памерам аплаты 60 руб. з чалавека [**21**, л. 17].

У 1946 г. была створана сетка партасветы, дзе праводзіліся семінары па гісторыі партыі, вывучаліся біяграфіі У. Леніна і І. Сталіна. З восені 1948г. у Полацку пачаў працаваць вячэрні інстытут марксізму-ленінізму пры Абкаме КПБ. У 1950/1951 навучальным годзе ў абласным цэнтры працавала 29 палітшкол, 17 гурткоў па вывучэнні біяграфій класікаў марксізму-ленінізму, 61 гурток па вывучэнні «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)», 2 вячэрнія партшколы і вячэрні інстытут [**18**, с. 241].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Культура**

***Кінатэатры.*** Пытанні развіцця культуры і аднаўлення сеткі ўстаноў культуры разглядаліся ўжо на адным з першых пасяджэнняў гарсавета ў жніўні 1944 г. Раней за ўсё было прынята рашэнне аб перадачы будынка па вул. Леніна, 19 на пастаяннае карыстанне кінатэатру, у якім на першым сеансе дэманстраваўся фільм «Сталінград» [**20**, л. 19; 14]. Для наладжвання абслугоўвання ўсім арганізацыям і ўстановам, якія мелі мэблю і іншую маёмасць, што належала кінатэатру, было загадана здаць яе за 2 дні Полацкаму гарадскому кінатэатру [**20**, л. 27]. На пачатку лаўкі ў кіназале не мелі нумарацыі, і гледачы займалі месцы адвольна. З цягам часу з усходняга боку было прыбудавана драўлянае памяшканне, у якім размясцілася фае, каса, а ў зале паставілі лаўкі са спінкамі і нумарацыяй [**17**, с. 281]. Начальнік упраўлення кінафікацыі тав. Сушкевіч арганізаваў 4 кінасеансы і не менш за 4 вечары танцаў у памяшканні кінатэатра, выручка ад якіх была накіравана ў дапамогу дзецям-сіротам [**23**, л. 46].

У 1945 г. у Полацку было ўжо два кінатэатры, штат якіх быў зацверджаны ў маі: штат кінатэатра № 1 (па вул. Леніна) — 10 адзінак з фондам зарплаты 2405 руб./месяц, кінатэатра № 2 — 12 адзінак з фондам 2725 руб./месяц [**4**, л. 26]. Другому кінатэатру адвялі стары будынак па вул. Савецкай. Аднак пабудова была моцна разбурана, таму кінатэатр № 2 размясціўся ў памяшканні Кадэцкага корпуса. Дзейнасць гэтай установы выклікала шматлікія нараканні з боку грамадскасці і кіраўніцтва горада за сістэматычныя зрывы сеансаў, прысутнасць на вячэрніх сеансах падлеткаў да 16 гадоў, дапушчэнне нецвярозых грамадзян нявтлівае абслугоўванне гледачоў з боку адміністрацыі і дрэнны стан (зала і падсобныя памяшканні былі недастаткова асветлены, у вокнах адсутнічала шкло, сцены былі не пабелены) [**20**, л. 147]. У пачатку 1946 г. рашэннем гарвыканкама памяшканне кінатэатра № 2 было перададзена Абласному дому народнай творчасці [**20**, л. 7].

Летам таго ж года ў сувязі з пагрозай абвалу перакрыццяў столі быў закрыты на рамонт кінатэатр «Радзіма» (былы № 1). На перыяд правядзення рамонтных работ дырэктару кінатэатра тав. Каскевіч было дазволена праводзіць кінасеансы ў памяшканні гарклуба [**19**, л. 26]. Адначасова з гэтым Абласному ўпраўленню кінафікацыі для аднаўлення са змяненнем архітэктуры галоўнага фасада быў перададзены будынак былога кінатэатра «Інтэрнацыянал» па вул. Савецкай 47/17, які быў канчаткова здадзены ў 1948 г. [**20**, л. 61]. У першы ж год работы кінатэатра ў новым будынку было праведзена 1300 кінасеансаў [**20**, л. 79]. У вольным будынку па вул. Леніна вырашана было размясціць гарадскі клуб, пазней — Дом піянераў. Колькасць наведвальнікаў кінатэатра павялічвалася з кожным годам. Так, гадавы план 1950 г. быў выкананы на 100,2 % за 10 месяцаў [**21**, л. 16]. Асаблівае нараканне з боку гарадскога кіраўніцтва выклікала няўдалая арганізацыя рэкламы ў мікрараёнах і недастатковае афармленне кінатэатра нагляднай агітацыяй (лозунгі, плакаты), а таксама культурна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветніцкая работа сярод гледачоў: малая зала не выкарыстоўвалася для правядзення лекцый (за 10 месяцаў праведзена толькі 12 лекцый, ніводнай лекцыі пра выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў) [**20**, л. 180]. Кінатэатр «Радзіма» лічыўся кінатэатрам І тыпу, таму квіткі каштавалі на 1 рубель даражэй за квіткі ў кінатэатр ІІ класа. Яго будынак быў адным з самых буйных у рэспубліцы [**20**, л. 290]. З арганізацыяй летняга кінатэатра ў мікрараёне Задзвінне ў 1952 г. у Полацку працавала ўжо 2 кінатэатры на 500 і 200 месцаў [**9**, с. 14].

***Бібліятэкі.*** Патрэба ў бібліятэцы паўстала ў жніўні 1944 г., калі на пасяджэнні гарвыканкама абмяркоўвалася падрыхтоўка да новага навучальнага года і было прынята рашэнне адкрыць у Полацку 1 бібліятэку. Абласная бібліятэка была адкрыта ў красавіку 1945 г. у памяшканні былога Кадэцкага корпуса [**20**, л. 11]. З арганізацыяй абласной бібліятэкі паўстала пытанне аб адкрыцці гарадской публічнай бібліятэкі з чытальнай залай, якую планавалася размясціць у Доміку Пятра І. У 1947 г. гарбібліятэцы было прадастаўлена занятае раней памяшканне па вул. Леніна, 23 [**20**, л. 110].

Наладзіць працу ў пасляваенным горадзе было нялёгка. Праз 4 гады пасля вызвалення гарадская бібліятэка (загадчык тав. Паўлючэнка) пры поўным укамплектаванні штату – 3 чалавекі – працавала, на погляд кіраўніцтва, не здавальняюча: не вёўся ўлік кніг, не праводзіліся лекцыі. Бібліятэку наведвала ўсяго 129 дарослых і 151 маленькі чытач (6 дарослых і 25 дзяцей на дзень), у той час як яе фонд складаў 4871 экзэмпляр. Знаходзілася бібліятэка ў маленькім пакоі памерам 4,5×5 метраў, не мела чытальнай залы і кнігасховішча [**20**, л. 79]. У 1949 г. з’явілася чытальная зала, дзе было арганізавана 17 выстаў, прысвечаных знамянальным датам, а па нядзелях праводзіліся гучныя чытанні часопісаў і газет; колькасць чытачоў складала ўжо 1473 чалавекі [**22**, л. 187]. Толькі ў 1951 г. для гарадской бібліятэкі аднавілі спецыяльны будынак [**7**, л. 12].

З года ў год павялічваўся кніжны фонд: з 1947 па 1951 г. толькі ў абласной бібліятэцы ён вырас з 32 тыс. да 90 тыс. тамоў, у гарадской бібліятэцы за аналагічны перыяд – амаль у 7 разоў [**4**, л. 77]. З павелічэннем бібліятэчнага фонду ў 1948 г. у Полацку адкрылася дзіцячая бібліятэка (сёння дзіцячая бібліятэка імя Л. Талстога), у 1950 г. – гарадская бібліятэка № 2 (сёння бібліятэка імя Я. Купалы) і ў 1952 г. – дзіцячая бібліятэка № 2 (сёння дзіцячая бібліятэка імя Я. Журбы). Шырыўся і спектр паслуг: у 1949 г. пры абласной бібліятэцы быў створаны міжбібліятэчны абанемент, па якім можна было атрымаць кнігі па розных галінах навукі з бібліятэк Мінска, Масквы, Ленінграда. Так, выкладчык педвучылішча Б. Пятровіч выпісаў 8 новых кніг па літаратуры, мастацтве, мовазнаўстве, а заслужаны ўрач БССР Б. Бараўскі – 6 кніг па медыцыне [**1**]. У 1951 г. у Полацку працавалі: абласная бібліятэка з кніжным фондам 93950 экзэмпляраў, 2 гарадскія і 1 дзіцячая бібліятэкі з фондам 29250 экзэмпляраў, прафсаюзныя, ведамасныя і школьныя бібліятэкі з агульным кніжным фондам 5430 экземпляраў [**7**, л. 12]. Аднак на той час толькі гарадская бібліятэка № 1 і дзіцячая бібліятэка знаходзіліся ў прыстасаваных памяшканнях [**7**, л. 57].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дапамогу тым, хто ўсе намаганні прыкладаў да аднаўлення роднага горада, былі арганізаваны бібліятэкі-перасоўкі. У 1951 г. такіх налічвалася 20, яны абслугоўвалі больш за 1500 рабочых і служачых [**18**, с. 244]. Ствараліся ведамасныя бібліятэкі ў розных арганізацыях горада.

У 1952 г. у Полацку ўжо 4 гарадскія, 9 прафсаюзных і 12 ведамасных бібліятэк, 22 бібліятэкі-перасоўкі на прадпрыемствах горада [**7**, л. 57]. Кніжны фонд складаў 179 тыс. кніг. Колькасць чытачоў дасягнула 3480 чалавек, з якіх 970 былі чытачамі дзіцячых бібліятэк [**7**, л. 12]. У 1954 г. у сувязі з ліквідацыяй Полацкай вобласці абласная бібліятэка была рэарганізавана ў цэнтральную гарадскую бібліятэку і пераведзена ў новае памяшканне па вул. Гогаля, 15.

***Музей.*** За перыяд Вялікай Айчыннай вайны фонды адзінага полацкага музея былі разрабаваны. Рэшткі калекцый – 462 прадметы – у пасляваенны час захоўваліся ў Сафійскім саборы, экспазіцыі не было [**5**, с. 13]. У студзені 1946 г. абласное кіраўніцтва разгледзела пытанне аб арганізацыі ў Полацку абласнога гісторыка-краязнаўчага музея. Для яго размяшчэння найперш было прапанавана памяшканне Доміка Пятра І. Патрабавалася выселіць з помніка работнікаў абласной канторы сувязі, перадаць яго абладдзелу культасветработы і стварыць там музей [**21**, л. 92]. Але, напэўна, па прычыне недахопу жылой плошчы ад гэтай ідэі адмовіліся. Увага была скіравана на Сафійскі сабор. Гарадскія ўлады прынялі рашэнне прыступіць да састаўлення праекта і каштарыса на рамонт сабора і арганізацыі ў ім музея. Заяву вернікаў аб выкарыстанні Сафійскага сабора для богаслужэнняў адхіліла [**21**, л. 242]. Аднак і гэтае рашэнне не спраўдзілася, і ў 1948 г. зноў вярнуліся да ідэі адвесці пад музей і гарадскую бібліятэку Домік Пятра І па вул. Сака і Ванцэці.

З аднаўленнем будынка кінатэатра «Інтэрнацыянал» у 1948 г. вольнае памяшканне былой лютэранскай кірхі адвялі пад музей. Яго адкрыццё было запланавана к святкаванню 30-годдзя БССР. Экспанаты абласнога музея павінны былі распавядаць пра гістарычнае мінулае, утварэнне Савецкай улады, дасягненні прамысловасці і сельскай гаспадаркі за апошнія 30 год. Аддзел сацыялістычнага будаўніцтва атрымаў узоры прадукцыі асобных прадпрыемстваў горада і вобласці. Шырока павінны былі быць прадстаўлены ў экспазіцыі музея матэрыялы па Вялікай Айчыннай вайне, сярод якіх – партызанская і трафейная зброя, экзэмпляры газеты «Бальшэвіцкі сцяг», што выходзіла ў час вайны як орган Полацкага падпольнага РК КП(б)Б, друкарскія станкі, фатаграфіі горада адразу пасля вызвалення і ў перыяд аднаўлення. Гісторыю Полаччыны прадстаўлялі такія экспанаты, як агнястрэльная зброя, манеты 1642 і 1812 г., летапіс 1774 г., фатаграфіі прыезду ў Полацк Мікалая ІІ, пераносу мошчаў Еўфрасінні ў 1910 г. і шэраг іншых [**13**]. Аднак да свята была падрыхтавана толькі фотавыстава «30 лет Советской Белоруссии» [**2**]. Пакуль ішлі падрыхтоўчыя работы да адкрыцця музея, супрацоўнікі стварылі перасоўную выставу «Творцы савецкай аграбіялогіі», прысвечаную Мічурыну, Вільямсу і Лысенку. Разам з лектарамі абласнога лекцыйнага бюро выставу адправілі ў кал-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гасы вобласці [**15**]. Летам 1949 г. Полацкі абласны краязнаўчы музей быў гатовы прыняць сваіх першых наведвальнікаў. У экспазіцыі музея былі прадстаўлены шматлікія археалагічныя матэрыялы: косці мамонта, каменныя сякеры, прадметы бронзавага веку, а таксама старажытная зброя, манеты XVIII–XX стст., мінералы і г.д. Вялікая колькасць экспанатаў распавядала пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны і яе герояў: узоры трафейнай зброі і самаробнай зброі партызан, фатаграфіі байцоў і афіцэраў Чырвонай Арміі, мастацкія палотны «Салют Радзімы» В.Б. Элькона, «Пераможаны Берлін» Ф.М. Бараноўскага. Экспазіцыю музея ўпрыгожвалі некалькі карцін В.М. Васняцова [**3**]. Распрацоўкай прыкладных экспазіцыйных планаў для Полацкага абласнога музея займаліся супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны [**5**, с. 13–14]. Шмат увагі ў музейнай дзейнасці ўдзялялася арганізацыі перасоўных выстаў. Так, выставу «Сталинская Конституция – Конституция победившего социализма», якая аб’ехала 8 раёнаў Полацкай вобласці, наведала 4500 чалавек [**5**, с. 13]. Павялічвалася і колькасць наведвальнікаў галоўнага музея вобласці. Толькі ў 1954 г. гэтая лічба склала больш за 3 тыс. жыхароў Полацка і бліжэйшых раёнаў [**18**, с. 244].

***Клубы і іншыя ўстановы культуры.*** Для культурнага адпачынку гараджан у абласным цэнтры былі арганізаваны гарадскі клуб на 350 месцаў, ведамасныя клубы і чырвоныя куткі на прадпрыемствах горада, Дом народнай творчасці (дырэктар А.М. Фурын), гарадская танцавальная пляцоўка (кошт білета ў 1947 г. складаў 5 руб.), праводзіліся лекцыі, ствараліся калектывы мастацкай самадзейнасці. У студзені 1945 г. у памяшканні царквы па вул. Леніна, 38 быў арганізаваны Клуб моладзі [**21**, л. 19]. У 1948 г. на птушкакамбінаце, хлебакамбінаце, ліцейна-механічным заводзе былі створаны чырвоныя куткі. Культурным жыццём вобласці кіравала арганізаваная ў сакавіку 1945 г. пры аблсавеце культурна-асветніцкая пастаянна дзеючая камісія з 5 чалавек, якую ўзначаліў М.М. Мышко [**21**, л. 111]. У 1952 г. у Полацку было 9 прафсаюзных і ведамасных клубаў, гарадскі клуб, 25 чырвоных куткоў, 12 калектываў мастацкай самадзейнасці [**9**, с. 14]. Складаная сітуацыя захоўвалася з развіццём культурнага жыцця ў мікрараёнах. Так, на пачатку 1948 г. у Задзвінні ўвогуле не было ніякіх культурных устаноў. Аднак з упарадкаваннем цэнтральнай часткі горада ўвага ўлады была скіравана на развіццё ўскраін. К 1954 г. у Задзвінні дзейнічалі кінатэатр і клуб прамысловай арцелі «Парыжская камуна».

Цэнтрам культурнага жыцця быў гарадскі клуб (загадчык тав. Раскіна), які месціўся на першым паверсе Кадэцкага корпуса каля Мікалаеўскага сабора. Сіламі работнікаў клуба праводзіліся як гарадскія, так і абласныя мерапрыемствы. У пачатку мая 1945 г. быў праведзены першы абласны агляд мастацкай самадзейнасці, прайшла абласная алімпіяда творчасці выхаванцаў дзіцячых дамоў, у канцы мая 1946 г. – алімпіяда мастацкай самадзейнасці па Полацкай вобласці, у верасні 1947 г. – абласны агляд драмгурткоў і калектываў, прысвечаны рабоце над савецкай п’есай. За першую палову 1948 г. у клубе было

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прачытана 20 лекцый на палітычна-эканамічныя і гістарычныя тэмы (12), літаратурныя (3), прыродазнаўча-навуковыя (1), медыцынскія (3), грамадска-навуковыя (1) тэмы, якія наведалі 3110 слухачоў, 2 платныя і 10 бясплатных вечарын мастацкай самадзейнасці, паказаны 33 кінакарціны, арганізавана 16 выстаў прафесійных калектываў, праведзена 33 грамадска-партыйныя сходы і канферэнцыі, 5 вечарын моладзі, 1 навагодні баль-маскарад, 23 платныя вечары танцаў. Пры клубе працавалі харавы, народных танцаў, струнны, драматычны гурткі і займалася група салістаў. За адзначаны перыяд было толькі 20 вольных дзён па прычыне адсутнасці электрычнасці [**20**, л. 102]. Работнікі клуба стараліся разнастаіць культурную праграму. У 1949 г. у клубе было прачытана12 лекцый, праведзена 45 эстрадных канцэртаў і спектакляў, 29 канцэртаў мастацкай самадзейнасці, 3 літаратурна-мастацкія вечарыны і 2 вечары пытанняў і адказаў [**22**, л. 186].

З мэтай пашырэння навуковых ведаў сярод насельніцтва пры аддзеле культасветустаноў была створана лектарская група з 20 чалавек [**9**, с. 14]. Пры розных установах было арганізавана 7 лекторыяў [**20**, л. 272]. З мэтай пашырэння прапаганды прыродазнаўча-навуковых ведаў сярод насельніцтва горада ўлетку 1948 г. быў дадаткова зацверджаны склад няштатнай гарадской лектарскай групы. У яе складзе былі выдзелены секцыі фізікі, гісторыі, мовы і літаратуры, прыродазнаўчая, якую ўзначальваў У.К. Азернікаў, медыцынская пад кіраўніцтвам В.С. Магаршака [**20**, л. 18]. За год колькасць лектараў пры аддзеле павялічылася да 25 чалавек (19 настаўнікаў і 4 урачы), імі было прачытана 314 лекцый. Лектарскай групай кіраваў Л.П. Казлоў, секцыяй мовы і літаратуры Н.П. Ярмак, фізікі і геаметрыі І.П. Дэйніс, працавалі таксама секцыі гісторыі, медыцыны, юрыдычная [**20**, л. 65]. У 1951 г. у складзе лектарскай групы ўжо 42 лектары [**20**, л. 272]. Толькі за першае паўгоддзе 1951 г. яны прачыталі 157 лекцый, якія праслухалі 13887 чалавек. Больш паловы лекцый (82) былі на грамадска-палітычныя тэмы («Партыя Леніна-Сталіна, кіруючая і накіроўваючая сіла Савецкага грамадства», «Вялікія будоўлі камунізма» і г.д.), 22 лекцыі на прыродазнаўча-навуковыя тэмы («Аб анцінароднай дзейнасці Ватыкана», «Вечнасць і матэрыяльнасць свету» і інш.), 19 — на медыцынскія («Сучасная сістэма аховы здароўя ў капіталістычных краінах», «Інфекцыйныя хваробы і барацьба з імі») і 16 лекцый былі прысвечаны літаратуры [**7**, л. 12].

**Фізкультура і спорт**

Немалаважнае значэнне ў пасляваенны перыяд мела развіццё спорту і фізічнай культуры. Ужо ў верасні 1944 г., улічыўшы неабходнасць заняткаў моладзі і навучэнцаў старэйшых класаў лёгкай атлетыкай, а таксама наведвання секцый валейболу, баскетболу і футболу, гарадскія ўлады прадаставілі клубу фізкультуры раней занятае ім памяшканне па вул. Леніна [**20**, л. 26]. З-за фінансавых праблем доўгі час працягваліся работы па добраўпарадкаванні спартыўных аб'ектаў і назапашванні матэрыяльнай базы. Адзіны ў Полацку



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стадыён у Прасмушках, пабудаваны да Вялікай Айчыннай вайны, быў у першую чаргу месцам правядзення пасляваенных дэманстрацый, яшчэ ў 1948 г. на тэрыторыі стадыёна знаходзіліся гароды мясцовых жыхароў [**16**, л. 29].

15–17 ліпеня 1945 г. Полацк прымаў спартсменаў з усёй вобласці, якія ўдзельнічалі ў абласной летняй спартакіядзе ў гонар гадавіны вызвалення БССР, правядзенне якой у наступныя гады стала традыцыяй [**21**, л. 29]. 8–10 верасня 1945 г. у абласным цэнтры прайшло фізкультурнае свята, прысвечанае адкрыццю цэнтральнага стадыёна вобласці. Спартыўнае мерапрыемства наведала рэспубліканская дэлегацыя фізкультурнікаў – удзельнікаў усесаюзнага парада ў г. Маскве [**21**, л. 78]. У 1946 г. аднавіла дзейнасць абласное таварыства «Спартак» [**20**, л. 45], колькасць фізкультурнікаў і спартсменаў расла. У ліпені 1946 г. спартыўная каманда з 87 чалавек удзельнічала ў 2-й Усебеларускай спартакіядзе ў г. Мінску [**21**. л. 61].

Згодна з планам развіцця Полацка, складзеным архітэктарам І. Рапапортам у 1937–1938 гг., была распрацавана дэталёвая планіроўка вострава на левым беразе Заходняй Дзвіны пад парк адпачынку з наступнымі спартыўнымі аб'ектамі: пляцоўкі для тэніса, валейбола, купальныя і водная станцыі, більярдныя, шашачныя, шахматныя. Зацверджаны Саветам Міністраў БССР у жніўні 1948 г. новы генеральны план аднаўлення і развіцця горада ў многім паўтараў папярэдні дакумент. На левым беразе Заходняй Дзвіны было вырашана разбіць парк з фізкультурным комплексам.

Шмат увагі надавалася аздараўленню школьнікаў у перыяд летняга адпачынку. Пры школах арганізоўваліся спецыяльныя пляцоўкі, дзе праводзіліся мерапрыемствы летняй фізкультурна-аздараўляльнай кампаніі. Абласны камітэт па справах фізкультуры і спорту (старшыня тав. Купцоў) клапаціўся і аб развіцці зімовых відаў спорту: кожны год залівалі гарадскі каток, на якім у 1947 г. была арганізавана лыжная база [**16**, л. 29].

Найбольшае распаўсюджанне спорт і фізічная культура атрымалі ў канцы 1940-х – пачатку 1950-х гг. У 1950 г. у Полацку было 50 калектываў фізічнай культуры, якія ахаплівалі каля 4 тыс. чалавек. У наступным годзе іх было ўжо 70, у іх займалася 5550 чалавек [**7**, л. 16]. Для спартыўных заняткаў былі арганізаваны 1 малы стадыён, 2 спартыўныя пляцоўкі, 1 футбольнае поле, 11 баскетбольных пляцовак, 76 валейбольных пляцовак, тэнісны корт на стадыёне [**7**, л. 150]. Для жадаючых працавалі 25 секцый па лыжах, якія наведвала 50 чалавек, 21 канькабежная секцыя на 220 чалавек і 6 секцый па хакеі, якія аб'ядноўвалі 78 чалавек [**7**, л. 16]. Працавала дзіцячая спартыўная школа (дырэктар М.Я. Карасёў) [**21**, л. 199].

Асаблівае развіццё ў пасляваенным Полацку атрымаў футбол: было створана 11 дарослых, 8 юнацкіх і 2 дзіцячыя футбольныя каманды. Усе яны ўдзельнічалі ў розыгрышах першынства горада. Асабліва адзначылася каманда «Спартак», якая іграла ў 2-й групе. У 1951 г. яна ні разу не прайграла, а на першынстве рэспублікі заняла першае месца і была пераведзена ў 1-ю групу [**7**, л. 16]. На на-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступны год на першынстве рэспублікі полацкі «Спартак» заняў 7-е месца сярод 12 каманд, а юнацкая футбольная каманда заняла 3-ю пазіцыю [**7**, л. 62].

У 1954 г. у Полацку былі створаны 62 калектывы, якія аб'ядноўваліся ў добраахвотныя спартыўныя аб'яднанні «Спартак», «Лакаматыў», «Медык», «Буравеснік», «Іскра», «Будаўнік» і інш. [**18**, с. 245].

Першае пасляваеннае дзесяцігоддзе для народнай гаспадаркі Полацка было, напэўна, самым цяжкім за ўсё XX ст. Пасля вызвалення ў ліпені 1944 г. палачанам прыйшлося нанова аднаўляць спустошаны горад, дашчэнту разбураныя прадпрыемствы, наладжваць сетку ўстаноў адукацыі і культуры. Немалаважнае значэнне для Полацка ў гэты перыяд мела наданне яму пастановай Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР ад 20 верасня 1944 г. статусу цэнтра вобласці, а таксама матэрыяльная дапамога з боку рэспубліканскіх улад, якая выдзялялася абласцям і ў першую чаргу размяркоўвалася сярод арганізацый абласных цэнтраў.

Перыяд існавання Полацкай вобласці прыпаў на 2 пасляваенныя пяцігодкі — 4-ю (1946–1950 гг.) і 5-ю (1951–1955 гг.). Іх планы аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі прадугледжвалі пераўтварэнне зруйнаванага Полацка ў магутны эканамічны, прамысловы і культурны цэнтр вобласці і рэспублікі ў цэлым. У першую чаргу былі адноўлены прадпрыемствы энергетычнай і харчовай прамысловасці: электрастанцыя, хлебакамбінат, мясакамбінат, а таксама арцелі па вырабе тавараў шырспажыву. Менавіта дзейнасць апошніх у першыя гады пасля вызвалення, калі буйныя прадпрыемствы толькі нарошчвалі вытворчыя магутнасці, аказала значную дапамогу насельніцтву ў забеспячэнні таварамі і прадуктамі першай неабходнасці. У канцы першай пасляваеннай пяцігодкі ў горадзе аднавілі сваю работу і працавалі ўсе прадпрыемствы, што дзейнічалі да вайны. У далейшым яны нарошчвалі энергетычную базу, асвойвалі новыя віды прадукцыі, механізавалі вытворчыя працэсы.

Кантроль за аднаўленнем Полацка здзяйснялі Полацкія абласны і гарадскі саветы дэпутатаў і выканаўчыя камітэты. На кожным пасяджэнні яны разглядалі пытанні наладжвання грамадскага харчавання, аднаўлення жыллёвага фонду, разгортванне сеткі ўстаноў адукацыі і культуры. Асаблівыя цяжкасці выклікала размеркаванне ацалелых і рамантуемых памяшканняў паміж гараджанамі і арганізацыямі. Недахоп жылля не ўдалося поўнасцю ліквідаваць нават да канца 5-й пяцігодкі. Адсутнасць вольных памяшканняў стварала складаную сітуацыю ў школах, дзе ў 1-м пакоі маглі вучыцца адначасова да 60 чалавек. Разам з дэфіцытам падручнікаў, дапаможнікаў і пісьмовых прылад гэта садзенічала маруднаму скарачэнню колькасці вучняў, якія не паспявалі за вучэбнай праграмай. Улады стараліся ахапіць навучаннем разнастайны кантынгент жыхароў Полацка: дзеці школьнага ўзросту, падлеткі, якія ўладкаваліся на працу, непісьменныя дарослыя. Пабудова спецыяльных школьных будынкаў, павышэнне кваліфікацыі настаўніцкіх кадраў і рост

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульнага дабрабыту палачан дапамаглі вырашыць усе праблемы пасляваеннай лакальнай сістэмы адукацыі.

З першых дзён пасля вызвалення шмат увагі надавалася аздараўленню насельніцтва, культурнаму адпачынку палачан, развіццю спорту. Найбольшыя намаганні ўрачоў былі прыкладзены да ліквідацыі ўспышкі інфекцыйных захворванняў, якія падмацоўваў антысанітарны стан горада і медыцынскіх устаноў. Вялікае значэнне ў пасляваенны час мела павелічэнне нараджальнасці і догляд за парадзіхамі і дзецьмі дашкольнага ўзросту, таму ў Полацку не толькі былі адкрыты радзільны дом, малочныя кухні, жаночая і дзіцячая кансультацыі, але і вялася жорсткая барацьба з крымінальнымі абортамі.

Для забеспячэння патрэб насельніцтва ўстановы культуры стваралі філіяльныя сеткі, праводзілі выязныя мерапрыемствы і стваралі перасоўныя выставы. У Полацку дзейнічалі абласныя (бібліятэка, Дом народнай творчасці) і гарадскія (клуб, кінатэатры) установы культуры, ствараліся чырвоныя куткі і калектывы мастацкай самадзейнасці на прадпрыемствах, чыталіся лекцыі, арганізоўваліся тэматычныя вечарыны. У гарадскім клубе выступалі сталічныя і мясцовыя артысты, праводзіліся абласныя агляды і алімпіяды сярод калектываў мастацкай самадзейнасці.

Каманды полацкіх спартсменаў прымалі ўдзел у рэспубліканскіх спаборніцтвах. Гарадскія калектывы па разнастайных відах спорту аб'ядноўвалі тысячы палачан, праводзілася планавая падрыхтоўка значкістаў ГПА. Для спартсменаў і фізкультурнікаў будаваліся спартыўныя пляцоўкі і назапашвалася матэрыяльная база спортінвентару.

Калі першую пасляваенную пяцігодку можна характарызаваць як аднаўленчую, то другая пяцігодка – аднаўленча-развіццёвы перыяд, калі адбудаваныя прадпрыемствы, арганізацыі і ўстановы, пераадолеўшы асноўныя праблемы пасляваенных гадоў, перайшлі да наладжвання стабільнай працы, назапашвання энергетычнай і матэрыяльнай базы для павелічэння тэмпаў вытворчасці і аб'ёмаў паслуг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры і крыніц**

1. Баланкова, П. Междубиблиотечный абонемент / П. Баланкова // Большевистское знамя. – № 14 (732). – 12 февраля 1949 г. – С. 2.

2. В краеведческом музее // Большевистское знамя. – № 48 (615). – 23 декабря 1948 г. – С. 2.

3. Гаттих, В. В областном краеведческом музее / В. Гаттих // Большевистское знамя. – № 38 (785). – 17 июня 1949 г. – С. 2.

4. Данные о развитии г. Полоцка за 1945–1964 гг. (Полоцкий промышленно-экономический район / Рукопись // Архіў Краязнаўчага музея – філіяла НПГКМЗ. – Полоцк, 1965. – 22 с.

5. Джумантаева, Т.А. Краязнаўчы музей Полацка (пач. 20 ст. – 70-я гг. 20 ст.) / Т.А. Джумантаева // Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (па выніках навукова-даследчай работы ў 1999 г.) / уклад. Т.А. Джумантаева. – Полацк: НПГКМЗ, 2000. – С. 5–15.

6. Докладные записки отделов и коммунальных предприятий исполкома о восстановлении их деятельности; статсведения горисполкома и других о репатриации, соцобеспечении и награждении жителей города, о жилищном фонде и по другим вопросам // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 18.

7. Доклады о работе исполкома Полоцкого городского Совета депутатов трудящихся // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 93, 110.

8. Дэйніс, І.П. Полоцк в ХХ веке / І.П. Дэйніс // НПГКМЗ. – КП 19-2345. – С. 210–237.

9. Итоги выполнения народнохозяйственного плана города Полоцка за 1952 год / Рукапіс // Архіў Краязнаўчага музея – філіяла НПГКМЗ. – Полацк, 1953. – 60 с.

10. Магаршак, В. Праблема рака / В. Магаршак // Большэвіцкі сцяг. – № 6 (472). – 6 красавіка 1947 г. – С. 2.

11. Материалы депутатам Полоцкого городского Совета депутатов трудящихся для отчёта перед избирателями / Рукапіс // Архіў Краязнаўчага музея – філіяла НПГКМЗ. – Полацк, 1955. – 22 с.

12. Міхачоў, С. Узмацніць барацьбу супроць крымінальных абортаў / С. Міхачоў // Большэвіцкі сцяг. – № 34 (437). – 14 лютага 1947 г. – С. 2.

13. Осташкевич, П. К созданию музея в Полоцке / П. Осташкевич // Большевистское знамя. – № 37 (590). – 23 сентября 1948 г. – С. 2.

14. Па гораду і раёну // Большэвіцкі сцяг. – № 22 (34013). – 2 жніўня 1944 г. – С. 2.

15. Передвижная выставка // Большевистское знамя. – № 23 (742). – 15 марта 1949 г. – С. 2.

16. Переписка с республиканскими, областными и городскими учреждениями по вопросам восстановления и развития городского хозяйства и культуры, улучшения благосостояния трудящихся // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 57.

17. Полацкая даўніна / І.П. Дэйніс; уклад., прадм. і камент. М. Баўтовіча; пер. з ... мовы М. Ермалаева. – Мінск: Медисонт, 2007. – С. 300–305.

18. Полоцк: ист. очерк / АН БССР. ИН-т истории; редкол.: П.Т. Петриков (отв. ред.) и др. – 2-е изд., перераб и доп. – Минск: Наука и техника, 1987. – С. 233–238.

19. Постановления исполкома Полоцкого горсовета депутатов трудящихся и Полоцкого горкома КПБ // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 11, 22.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20. Протоколы заседаний исполкома Полоцкого горсовета депутатов трудящихся // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 2, 12, 23–24, 44, 52, 65, 78, 88.

21. Протоколы заседаний исполнительного комитета Полоцкого областного Совета депутатов трудящихся // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 686. – Воп. 1. – С. 16, 29, 30, 31, 53, 54, 55, 56, 83, 86.

22. Протоколы решений, доклады и др. материалы по подготовке для рассмотрения их на сессиях горсовета // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 658. – Воп. 1. – С. 65.

23. Распоряжения облисполкома по основной деятельности // Занальны дзяржаўны архіў у г. Полацку. – Фонд 686. – Воп. 1. – С. 28, 81.

24. Яноўская, В.В. У мірнай працы / В.В. Яноўская // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 693–700.

25. Яшчэ грымелі баі. З успамінаў І.П. Дэйніса // Памяць: гіст.-дакум. хроніка Полацка / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 491–493.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ